*УДК 94(476):316.346.32–053.6«1921/1939»*

# УЧАСТИЕ МОЛОДЕЖИ В НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНОЙ ЖИЗНИ СОВЕТСКОЙ БЕЛАРУСИ (1921–1939)

***В. В. ДАНИЛОВИЧ*** [1)]

[1)]*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрен процесс участия молодежи в национально-культурной жизни советской Беларуси в межвоенный период. Определены этапы и характерные особенности развития этого процесса. Утверждается, что с середины 1920-х гг. наблюдалась активизация участия в национально-культурной жизни БССР как белорусских юношей и девушек, так и молодежи национальных меньшинств. Участие же комсомольских структур в национально-культурном строительстве фактически до конца 1930-х гг. разворачивалось с трудностями: непродолжительные подъемы сменялись спадами. Только в конце рассматриваемого периода углубилась работа по воспитанию молодого поколения в духе интернационализма.

***Ключевые слова:*** советская власть; компартия; национальная политика; национальные права; молодежь; комсомол; образование; культура.

# УДЗЕЛ МОЛАДЗІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939)

***В. В. ДАНІЛОВІЧ*** [1*]

[1*]*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжаны працэс удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд. Вызначаны этапы і характэрныя асаблівасці развіцця гэтага працэсу. Сцвярджаецца, што з сярэдзіны 1920-х гг. назіралася актывізацыя ўдзелу ў нацыянальна-культурным жыцці БССР як беларускіх юнакоў і дзяўчат, так і моладзі нацыянальных меншасцей. Удзел жа камсамольскіх структур у нацыянальна-культурным будаўніцтве фактычна да канца 1930-х гг. разгортваўся з цяжкасцямі: непрацяглыя ўздымы змяняліся спадамі. Толькі напрыканцы разглядаемага перыяду паглыбілася праца па выхаванні маладога пакалення ў духу інтэрнацыяналізму.

***Ключавыя словы:*** савецкая ўлада; кампартыя; нацыянальная палітыка; нацыянальныя правы; моладзь; камсамол; адукацыя; культура.

# THE PARTICIPATION OF YOUTH IN NATIONAL CULTURAL LIFE OF SOVIET BELARUS (1921–1939)

***V. V. DANILOVICH*** [a]

[a]*Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Academičnaja Street, Minsk 220072, Belarus*

The process of youth participation in the national and cultural life of the Soviet Belarus in the interwar period is considered. The stages and characteristic features of the development of this process are determined. It is stated that since the mid-1920s there has been an increase in participation in the national and cultural life of the BSSR of both Belarusian boys

**Образец цитирования:**
Даніловіч ВВ. Удзел моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці савецкай Беларусі (1921–1939). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2018;4:19–27.

**For citation:**
Danilovich VV. The participation of youth in national cultural life of Soviet Belarus (1921–1939). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2018;4:19–27. Belarusian.

**Автор:**
***Вячеслав Викторович Данилович*** – кандидат исторических наук, доцент; директор.

**Author:**
***Vyachaslau V. Danilovich***, PhD (history), docent; director.
*danilovich_v@mail.ru*

and girls and youth of national minorities. The participation of Komsomol structures in the national and cultural construction was in fact developed with difficulties until the end of the 1930s: short rises were followed by recessions. Only at the end of the period under review did the work on educating the younger generation in the spirit of internationalism deepen.

***Key words:*** Soviet power; Communist party; national policy; national rights; youth; Komsomol; education; culture.

## Уводзіны

Як вядома, на хвалі рэвалюцыйнага ўздыму СНК РСФСР яшчэ 2 лістапада 1917 г. прыняў адзін з першых дэкрэтаў савецкай улады – Дэкларацыю правоў народаў Расіі. Дакумент прадугледжваў роўнасць і суверэннасць народаў Расіі, іх права на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і будаўніцтва самастойнай дзяржавы, адмену ўсіх і ўсялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў, свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнічных груп.

Менавіта на падставе гэтай дэкларацыі і будавалася нацыянальная палітыка бальшавікоў, у тым ліку і на тэрыторыі савецкай Беларусі, да якой мы адносім ССРБ і этнічна беларускія землі РСФСР, якія ў 1924 і 1926 г. былі вернуты ў склад БССР.

Маладзёжная палітыка ў разглядаемы перыяд непасрэдна была звязана з агульнай палітыкай дзяржавы, падмуркам якой з'яўлялася камуністычная ідэалогія. Кіраўніцтва кампартыі выдатна разумела значэнне маладзёжнага фактару ў палітыцы. З прыходам да ўлады бальшавікі рабілі ўсё, каб падпарадкаваць маладое пакаленне ідэалагічнаму кантролю праз сістэму адукацыі і стварэнне камсамола, які разглядаўся як інструмент для ўздзеяння на юнакоў і дзяўчат у патрэбным рэчышчы. Адпаведныя ідэалагічныя ўстаноўкі захоўваліся і пры ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Разам з тым улічвалася і спецыфіка савецкай Беларусі, якая заключалася ў шматнацыянальным складзе насельніцтва, а таксама перавазе беларусаў у сельскай мясцовасці, а яўрэяў – у мястэчках і гарадах. Таму ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі тут прадугледжвала ўлік інтарэсаў нацыянальных меншасцей, галоўным чынам яўрэяў, палякаў і латышоў. Для каардынацыі адпаведнай працы пры камітэтах кампартыі і камсамола дзейнічалі яўрэйскія, польскія і латышскія бюро. Пры гэтым асаблівая ўвага надавалася падрастаючаму пакаленню, бо менавіта моладзь дзякуючы неабцяжаранасці вопытам лёгка ўспрымае ўсё новае і з'яўляецца рухавіком любыхператварэнняў.

Пад моладдзю, як правіла, разумелася насельніцтва ва ўзросце 14–23 гадоў, прычым у рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі асаблівая ўвага надавалася асобам малодшага ўзросту, (14–18 гадоў), якія часта называліся падлеткамі. Разам з тым з сярэдзіны 1930-х гг. верхняя ўзроставая планка для моладзі была перасунута да 28 і нават 30 гадоў.

Аднак да гэтага часу праблема ўдзелу моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. не стала аб'ектам комплекснага даследавання. У гістарыяграфіі прадстаўлены асобныя сюжэты па дадзенай праблематыцы. Пры гэтым агульным недахопам гістарычных прац савецкага часу было імкненне не выходзіць за рамкі агульнапрынятых, фактычна запраграмаваных установак. Гэта непазбежна спараджала аднамернасць ацэнак, вяло да лакіроўкі і замоўчвання фактаў, якія не адпавядалі афіцыйнаму пункту гледжання.

Мэта дадзенага артыкула – раскрыць працэс удзелу моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. і вызначыць яго характэрныя асаблівасці.

## Асноўная частка

У першую чаргу савецкія ўлады надавалі ўвагу забеспячэнню нацыянальных правоў у сферы адукацыі. Так, у 1921 г. у ССРБ дзейнічалі беларускі і яўрэйскі педтэхнікумы, а таксама двухгадовыя польскія настаўніцкія курсы. З 1922 па 1937 г. падрыхтоўку настаўнікаў польскіх школ ажыццяўляў Мінскі польскі педтэхнікум імя Б. Весялоўскага [1, с. 93, 95, 228].

Ажыццяўленне дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў маладзёжным асяроддзі адбывалася ў першую чаргу праз камсамол. Так, камсамольскія камітэты савецкай Беларусі да знамянальных дат выпускалі аднадзённыя выданні на мовах нацыянальных меншасцей [2, с. 57].

Аднак, хаця ў пачатку 1920-х гг. у структуры ЦК КСМБ дзейнічалі яўрэйскае і польскае бюро, нацыянальная праца ў маладзёжным асяроддзі савецкай Беларусі больш-менш рэальна вялася толькі сярод яўрэйскай моладзі[1]. Такое становішча, на наш погляд, тлумачыцца тым, што сам камсамол у гэты час складаўся ў пераважнай большасці з яўрэяў. Тым не менш пераадолець адасоблены лад жыцця яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат не ўдавалася нават у камсамольскім асяроддзі.

Польскае бюро ЦК камсамола ССРБ вяло працу сярод беспартыйных маладых палякаў праз правядзенне канферэнцый, арганізацыю чытальняў, палітычных і спартыўных гурткоў. Бюро было арга-

[1]Рас. дзярж. арх. сац.-паліт. гісторыі. Ф. М1. Воп. 23. Спр. 68. Л. 65.

нізавана некалькі спектакляў на карысць палітвязняў у Польшчы. Але ўся гэта дзейнасць разгортвалася толькі ў Мінску, бо ў паветах не было адпаведных работнікаў[2].

Разам з тым пытанне неабходнасці беларусізацыі і пашырэння тэрыторыі ССРБ у рамках этнаграфічных межаў беларусаў турбавала ў пачатку 1920-х гг. многіх беларускіх дзеячаў, у тым ліку і камуністаў [3, с. 20–21].

Аднак на практыцы беларусізацыя навучальных устаноў, стварэнне новых культурна-асветніцкіх асяродкаў адбывалася дзякуючы намаганням у першую чаргу маладых беларусаў. Большасць з іх былі беспартыйнымі, хаця таксама прымалі ўдзел у гэтай справе нямала камуністаў і эсэраў. Розная партыйная прыналежнасць не перашкаджала ім у супольнай беларускай працы [4, с. 173].

Доўгі час уся беларуская нацыянальная справа ў савецкай Беларусі трымалася выключна на нешматлікіх маладзёжных гуртках, вакол якіх аб'ядноўваліся вучні старэйшых класаў школ, а таксама навучэнцы і студэнты мясцовых педагагічных і іншых навучальных устаноў [4, с. 206]. Дзейнічалі і беларускія вясковыя культурна-асветніцкія гурткі, у якія ўваходзіла таксама ў асноўным моладзь[3].

Пры гэтым сувязь і праца Камуністычнага саюза моладзі Беларусі (КСМБ, з 1924 г. – Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі, ЛКСМБ) з беларускай моладдзю ў пачатку 1920-х гг. заставаліся слабымі, што сведчыць аб наданні недастатковай увагі гэтаму пытанню і можа быць растлумачана тым, што з-за перавагі сярод членаў саюза юнакоў і дзяўчат яўрэйскай нацыянальнасці адпаведна пераважалі іх інтарэсы.

Пераломным для савецкай нацыянальнай палітыкі стаў 1923 г., калі ў красавіку на XII з'ездзе РКП(б) была звернута ўвага на неабходнасць вырашэння нацыянальнага пытання ў СССР. У рэалізацыі гэтай задачы павінен быў актыўна ўдзельнічаць і камсамол краіны.

У выніку на VI з'ездзе КСМБ, які адбыўся 4–8 мая 1923 г. у Мінску, упершыню з'явіліся афіцыйныя дакументы саюза на беларускай мове. На з'ездзе было абмеркавана пытанне «Быт і мова ў выхаваўчай рабоце камсамола»[4]. Так у саюзе з'явіліся першыя парасткі беларусізацыі. Неабходна адзначыць, што да гэтага з'езда нацыянальнае пытанне ў камсамоле ССРБ ніколі канкрэтна не ставілася.

Ужо 19 ліпеня 1923 г. пры бюро ЦК КСМБ (першы сакратар – М. Кузеніц) была створана спецыяльная камісія для працы з камсамольцамі і моладдзю розных нацыянальнасцей. На думку ўдзельнікаў ліпеньскага Пленума ЦК КСМБ, беларусізацыю трэба было весці павольна[5].

Аднак у працы КСМБ на той час важную ролю адводзілі ідыш і польскай мове, а да беларускай мовы адносіны былі абыякавыя. Увогуле, нягледзячы на тое, што з канца жніўня 1923 г. у ячэйках саюза прыярытэтнай стала праца з моладдзю на яе роднай мове, рэальна яна амаль не вялася[6].

У гэтым жа годзе ў БДУ быў уведзены абавязковы залік для студэнтаў па беларускай мове[7]. Адзначаўся рост нацыянальнай свядомасці беларускай моладзі і ў Гомельскай губерні[8].

З мэтай інтэрнацыянальнага выхавання маладога пакалення ў камсамольскіх клубах ладзіліся адпаведныя выставы, чыталіся лекцыі, праводзіліся вечарыны. У Мінску у 1923 г. быў нават створаны інтэрнацыянальны клуб моладзі, які арганізоўваў вечары інтэрнацыянальнай дружбы, сустрэчы з вядомымі дзеячамі міжнароднага камуністычнага руху, знаёміў з жыццём юнакоў і дзяўчат іншых краін. Усе камсамольцы былі членамі Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам (МАДР), ЦК якога на чале з Ю. Мархлеўскім у красавіку 1923 г. звярнуўся з заклікам да савецкай моладзі аб дапамозе «ахвярам капіталу». У выніку камсамольскія арганізацыі правялі нядзельнікі, а заробленыя на іх грошы былі перададзены МАДР. Камсамольскія структуры савецкай Беларусі вялі рэгулярную перапіску, мелі сталыя сувязі з камсамольскімі арганізацыямі Заходняй Беларусі, Польшчы і Літвы. У прыватнасці, выканкам Камуністычнага інтэрнацыяналу моладзі на чале з В. Вуёвічам у снежні 1923 г. адобрыў садружнасць камсамольскіх арганізацый БССР і Літвы [5, с. 147–148].

Тым не менш да верасня 1924 г. інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення і нацыянальная праца сярод яго вяліся эпізадычна[9].

Пры гэтым у актывістаў ЛКСМБ адзначалася адсутнасць дастатковай увагі да ўліку нацыянальных момантаў у працы (пытанне аб мове). Праца на родных мовах яўрэяў, палякаў і латышоў у саюзе амаль не вялася. Мала займаліся камсамольскія ячэйкі і беларусізацыяй[10].

Сярод моладзі (нават камсамольцаў) назіраліся незадаволенасць і супярэчнасці паміж палякамі

---

[2]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 18. Л. 52 ; Рас. дзярж. арх. сац.-паліт. гісторыі. Ф. М1. Воп. 23. Спр. 68. Л. 52.
[3]Дзярж. арх. Мінскай вобласці. Ф. 324. Воп. 1. Спр. 395. Л. 5 ; Там жа. Спр. 398. Л. 1 ; Там жа. Спр. 413. Л. 5.
[4]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 19. Л. 48–49.
[5]Там жа. Спр. 22. Л. 34, 36, 73 ; Там жа. Спр. 24. Л. 2.
[6]Там жа. Спр. 22. Л. 72, 82–83.
[7]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 12. Л. 6.
[8]Дзярж. арх. Гомельскай вобласці. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 310. Л. 2–3.
[9]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 33. Л. 157–158 ; Там жа. Спр. 37. Л. 28, 31.
[10]Там жа. Спр. 46. Л. 3 ; Там жа. Спр. 49. Л. 79.

і беларусамі, антысемітызм (асабліва сярод маладых рабочых-беларусаў), нацыянальная абмежаванасць (асабліва сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат), шавінізм[11].

У Мінску 12–14 мая 1924 г. адбыўся VIII з'езд КП(б)Б, які рэкамендаваў камсамолу БССР весці працу сярод юнакоў і дзяўчат на іх роднай мове, спрыяць развіццю нацыянальнай культуры [5, с. 164].

У выніку з 26 ліпеня 1924 г. ЦК ЛКСМБ, які ўзначаліў М. Арэхва, упершыню пачаў карыстацца беларускамоўнай пячаткай[12]. Аднак рэальная беларусізацыя ішла маруднымі тэмпамі. У ячэйках саюза праца вялася на нацыянальнай мове толькі ў тых рэдкіх выпадках, калі ўсе члены ячэйкі былі адной нацыянальнасці. Таму большасць камсамольскіх ячэек працавалі на рускай мове [5, с. 184].

Напрыканцы года пры большасці акруговых камітэтаў (АК) ЛКСМБ былі створаны гурткі беларусазнаўства. Аднак у некаторых АК да іх ставіліся несур'ёзна, і гурткі распадаліся (так адбылося, напрыклад, у Магілёве). На беларускую мову перайшлі ячэйкі педтэхнікумаў і партшкол. На вёсцы гурткі беларусазнаўства ахплівалі 50 % камсамольскіх ячэек[13].

Беларусізацыю актыўна падтрымала беларуская моладзь, асабліва вясковая. Маладыя беларускія патрыёты з энтузіязмам адгукаліся на заклікі Народнага камісарыята асветы БССР, Інстытута беларускай культуры і маладзёжнага літаратурнага аб'яднання «Маладняк», ехалі ў правінцыю, займалі пасады загадчыкаў раённых аддзелаў народнай адукацыі, культурна-асветніцкіх клубаў, бібліятэк, настаўнікаў, рэдактараў беларускамоўных газет [4, с. 217–218].

Пэўная колькасць навучэнцаў і студэнтаў – галоўным чынам не беларусы ці беларусы з гарадоў – пад уплывам праціўнікаў беларусізацыі з ліку выкладчыцкага саставу выступалі супраць выкладання прадметаў на беларускай мове, але большасць прыхільна ставіліся да беларусізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу, бо лічылі яе важным сродкам падрыхтоўкі нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, якой не хапала [3, с. 47, 103; 4, с. 216].

З 1924/25 навучальнага года ў тэхнікумах і ВНУ быў уведзены ўступны экзамен па беларускай мове. Беларусізацыі сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў таксама спрыяла палітыка іх пралетарызацыі, бо павелічэнне колькасці рабочых, і ў першую чаргу сялян, сярод студэнтаў непазбежна цягнула за сабой памяншэнне колькасці яўрэяў і рост колькасці беларусаў сярод іх [1, с. 82; 6, с. 117].

Адной з важкіх падстаў для правядзення палітыкі беларусізацыі ў сярэдзіне 1920-х гг. з'яўляліся сур'ёзныя адносіны маладых камуністаў на месцах да нацыянальнага пытання [7, с. 13; 8, с. 57].

Аднак у асяроддзі камсамольцаў савецкай Беларусі не было яснасці і адзінства ў пытанні неабходнасці беларусізацыі. На пленумах камсамола Віцебшчыны і Гомельшчыны ў верасні 1924 – студзені 1925 г. адзначалася, што некаторыя камсамольцы не разумелі сутнасці нацыянальнай палітыкі кампартыі, а частка актыву саюза нават адкрыта супраціўлялася беларусізацыі[14].

Тым не менш пры камсамольскіх камітэтах і ячэйках у гарадах БССР дзейнічалі гурткі па вывучэнні беларускай мовы і беларусазнаўству, у якіх займаліся актывісты саюза. Камсамольскія арганізацыі практыкавалі правядзенне вечарын беларускага мастацтва. Маладзёжнае літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», якое курыраваў камсамол, за 1924–1925 гг. выдала каля 30 зборнікаў вершаў і прозы на беларускай мове [5, с. 183–184].

Асноўная праца структур ЛКСМБ сярод маладых яўрэяў вялася на рускай мове. Разам з тым функцыянавалі пункты ліквідацыі непісьменнасці на ідыш. Яўрэйскія бюро дзейнічалі пры кожным камсамольскім АК. Аднак сакратары гэтых бюро часта змяняліся. Гэта вельмі перашкаджала працы галоўнага яўрэйскага бюро ЦК ЛКСМБ. Да 1925 г. колькасць ячэек саюза, якія працавалі на ідыш, вырасла да 35. Дзейнічалі каля 100 камсамольскіх яўрэйскіх палітгурткоў, якімі кіравалі былыя навучэнцы і настаўнікі яўрэйскіх школ, партшкол і тэхнікумаў. Яўрэйскія прапагандысцкія калектывы дзейнічалі ў Мінску (Мінскі калектыў налічваў 50 чалавек і з'яўляўся самым буйным), Бабруйску, Віцебску, Магілёве, Оршы, Полацку і Слуцку[15].

Значныя праблемы назіраліся ў дзейнасці польскага бюро ЦК ЛКСМБ: слаба былі вывучаны колькасць і настроі маладых палякаў, праца сярод іх ішла дрэнна, асабліва на вёсцы, адсутнічала сувязь з польскім бюро ЦК РЛКСМ[16].

Праца структур камсамола сярод латышскай моладзі першапачаткова вялася толькі ў Віцебскім АК, але 15 верасня 1924 г. латышскае бюро было ўтворана пры ЦК ЛКСМБ. Хаця ў саюзе на канец года мелася толькі 1 латышская ячэйка з 4 членаў у Бабруйскай акрузе, але дзейнічалі 19 латышскіх драматычных, сельскагаспадарчых і палітычных гурткоў[17].

[11]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 44. Л. 4 ; Там жа. Спр. 46. Л. 29 ; Там жа. Спр. 53. Л. 36.
[12]Там жа. Спр. 33. Л. 114.
[13]Там жа. Спр. 37. Л. 29.
[14]Баталко Т. И. Строительство белорусской национальной школы в условиях политики белорусизации. 1921–1930 годы (общественно-политический аспект) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01. Минск, 1993. С. 19–20.
[15]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37. Л. 48–49.
[16]Там жа. Воп. 1. Спр. 33. Л. 153 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 35. Л. 53.
[17]Там жа. Воп. 1. Спр. 33. Л. 166 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 35. Л. 11 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 150. Л. 1.

Увогуле толькі ў 1925 г. перад камсамолам былі пастаўлены канкрэтныя задачы па прыцягненні моладзі нацыянальных меншасцей у дзейнасць па эканамічным і культурным адраджэнні краіны, сціранні любой нацыянальнай розні. У выніку праца структур ЛКСМБ у гэтым кірунку ўзмацнілася і была афармлена арганізацыйна[18].

У 1925 г. ЦК ЛКСМБ пад кіраўніцтвам А. Самахвалава выпусціў 20 розных выданняў агульным тыражом 117 500 экзэмпляраў, з іх на беларускай мове – 13 (88 000 экзэмпляраў), на ідыш – 5 (20 500 экзэмпляраў), на польскай мове – 2 (7000 экзэмпляраў)[19]. Як бачым, прыярытэт мелі выданні на беларускай мове.

Тым не менш беларусізацыя ў камсамоле БССР ішла марудна і часта фармальна зводзілася толькі да пераводу апарата на беларускую мову. Адсутнічалі планамернасць, кантроль і арганізаванасць, не хапала палітычнай і камсамольскай літаратуры на беларускай мове. Рабочыя-беларусы недастаткова вылучаліся ў кадры раённага і акруговага камсамольскага актыву. У горадзе слаба вялася праца па тлумачэнні неабходнасці вывучэння беларускай мовы[20].

У парадку змяншэння ступені беларусізацыі ішлі спачатку ячэйкі, раённыя камітэты (РК), АК, а потым ЦК ЛКСМБ, які толькі часткова дасылаў матэрыялы на месцы на беларускай мове[21]. Як бачым, працэс беларусізацыі саюза адбываўся пераважна знізу.

Увогуле ў БССР таксама назіраліся фармальныя адносіны да беларусізацыі часткі навуковых работнікаў і студэнцтва, слабая актыўнасць кіруючых органаў ВНУ і студэнцкіх арганізацый у адносінах да беларусізацыі. Многія студэнты нават на старэйшых курсах не ведалі беларускай мовы[22].

Тым не менш з сярэдзіны 1920-х гг. выкладанне ў БДУ паступова пераводзілася на беларускую мову. Выпускнікі ўніверсітэта, якія не паспелі асвоіць беларускую мову падчас навучання, абавязаны былі на працягу года наведваць спецыяльныя курсы, каб здаць залік па беларускай мове і атрымаць пасведчанне [4, с. 203].

Паступова пашыралася нацыянальная праца сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат. На жнівень 1925 г. у БССР 80 камсамольскіх ячэек (35 гарадскіх, 32 мястачковыя, 13 вясковых) і больш 100 палітгурткоў працавалі на ідыш. Акрамя таго, у Мінску і Бабруйску дзейнічалі 2 яўрэйскія рабочыя ўніверсітэты і 5 вячэрніх школ для яўрэйскай моладзі[23].

Разам з тым афіцыйна адмаўлялася, што папярэднікамі ЛКСМБ з'яўляліся «Югендбунд» і «Кляйнбунд»[24], што сведчыць аб імкненні пазбавіцца погляду на камсамол як на пераважна яўрэйскую маладзёжную арганізацыю.

Нацыянальная праца сярод маладых палякаў і латышоў у БССР ажыццяўлялася ў 1925 г. дрэнна з-за адсутнасці штатных адзінак у АК камсамола. Каб вырашыць гэту праблему, у акругах і раёнах, дзе мелася польская ці латышская моладзь, замацоўваліся адпаведныя камсамольскія ўпаўнаважаныя для арганізацыі працы сярод яе, але часта рэальнай дзейнасці яны не вялі. Як вынік, у ЛКСМБ толькі 5 ячэек працавалі на польскай і 3 на латышскай мове[25].

Пры гэтым маладыя палякі ў большасці дрэнна адносіліся да камсамола. Толькі з другой паловы 1925 г. пачаўся перелом іх настрояў у бок прыхільнасці да савецкай улады і камсамола. Канферэнцыі польскай моладзі сталі ладзіцца камітэтамі і ячэйкамі ЛКСМБ не толькі ў раёнах, але і ў асобных вёсках. Увогуле расла грамадская актыўнасць юнакоў і дзяўчат нацыянальных меншасцей: удзел у культурна-асветніцкіх гуртках, падрыхтоўцы насценных газет і карэспандэнцый у друкаваныя выданні і г. д.[26]

У Гомельскай губерні ў першай палове 1920-х гг. камсамольская газета «Набат молодежи» шмат увагі надавала агітацыйнай працы сярод яўрэйскай моладзі [2, с. 95]. Аднак камсамольскія структуры Гомельшчыны ўпарта адмаўляліся ад прапаноў весці працу на ідыш, нават у мястэчках, дзе 90 % камсамольцаў былі яўрэямі і зусім не валодалі рускай мовай[27], што можа сведчыць як аб іх нежаданні абмяжоўваць сваю дзейнасць вузканацыянальнымі рамкамі, так і аб недахопе камсамольскага актыву, які б добра валодаў ідыш.

На Гомельшчыне фактычна не вялася і нацыянальная праца сярод беларускай моладзі[28]. Больш таго, некаторых юнакоў і дзяўчат нават выключалі з камсамола за спробы весці беларусізацыю [8, с. 185].

У 1926 г. па-ранейшаму агітацыйна-прапагандысцкая праца структур ЛКСМБ сярод яўрэйскіх, польскіх, латышскіх і літоўскіх юнакоў і дзяўчат вя-

[18]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 39. Л. 62 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 46. Л. 27.
[19]Там жа. Воп. 1. Спр. 54. Л. 97.
[20]Там жа. Спр. 37. Л. 9 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 42. Л. 14 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 46. Л. 28 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 49. Л. 194.
[21]Там жа. Воп. 1. Спр. 44. Л. 8 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 64. Л. 50.
[22]Там жа. Воп. 3. Спр. 11. Л. 369–370 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 214. Л. 1.
[23]Там жа. Воп. 1. Спр. 53. Л. 47 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 84. Л. 136.
[24]Там жа. Воп. 1. Спр. 51. Л. 72.
[25]Там жа. Спр. 37. Л. 5–6 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 59. Л. 20 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 127. Л. 23 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 144. Л. 25.
[26]Там жа. Воп. 1. Спр. 55. Л. 37 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 122. Л. 70 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 144. Л. 24.
[27]Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1713. Л. 69.
[28]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 64. Л. 116.

лася слаба [7, с. 84]. У «Чырвонай зьмене» недастаткова асвятляліся пытанні дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі[29].

Кастрычніцкі Пленум ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне перавесці ўсю працу апарата ЛКСМБ на беларускую мову к 1 студзеня 1927 г. [7, с. 87]. Для кожнага члена, кандыдата і работніка ЦК саюза быў вызначаны асабісты тэрмін авалодвання ёй. У выніку большасць раённага, акруговага і цэнтральнага камсамольскага актыву асвоіла беларускую мову, а «Чырвоная зьмена» цалкам перайшла на яе. Значная колькасць камсамольцаў-актывістаў была вылучана з ліку беларусаў[30].

Узмацнілася праца па беларусізацыі і сярод яўрэйскай моладзі ў Калініна, Мазыры, Оршы, Слуцку. Разам з тым частка маладога пакалення па-ранейшаму выступала супраць беларусізацыі[31].

Развівалася беларусізацыя і ў адукацыйнай сферы. У сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установах яна праводзілася паступова і сістэматычна, але больш марудна, чым у школах. Выкладанне ў педагагічных і сельскагаспадарчых тэхнікумах удалося беларусізаваць на 63 %, у іншых тэхнікумах – на 12–38 %, у сельскагаспадарчых школах – на 67 %, школах прафесійнага навучання – на 60 %, рабфаках – на 69 %, у ВНУ – на 17,5 %, у БДУ – на 31 %, у школах рабочай моладзі – на 100 %. К 1927 г. толькі педтэхнікумы цалкам перайшлі на беларускую мову [1, c. 88; 3, с. 56–57; 10, s. 138; 11, c. 146].

У 1927 г. з 14 педагагічных тэхнікумаў на беларускай мове працавалі 10, на ідыш – 3, на польскай – 1, дзейнічалі таксама яўрэйскае і польскае аддзяленні ў БДУ[32].

Кіраўніцтва ЛКСМБ на чале з А. Бараннікавым пашырала нацыянальную працу сярод маладых яўрэяў. У 1926–1927 гг. большасць местачковых камсамольскіх палітшкол была пераведзена на ідыш[33].

Аднак у 1927 г. структуры камсамола БССР па-ранейшаму слаба ўплывалі на польскую моладзь, якая знаходзілася пад значным ідэалагічным уплывам каталіцкага духавенства[34].

Увогуле ў ЛКСМБ адсутнічала стройная сістэма нацыянальнай працы сярод маладых палякаў. У АК саюза не хапала адпаведных штатных работнікаў. У польскім бюро ЦК саюза мелася толькі штатная адзінка сакратара [12, с. 25]. Усяго 11 ячэек саюза вялі працу на польскай мове (1 – у горадзе і 10 – у сельскай мясцовасці). Не было і статыстычных даных аб колькасці польскай моладзі. Нават камсамольцы-палякі недакладна ўлічваліся[35].

Тым не менш цікавасць польскіх юнакоў і дзяўчат да нацыянальна-культурнага жыцця і камсамола павялічвалася. Паступова пашыралася сетка палітадукацыі на польскай мове, у першую чаргу на вёсцы. Маладыя палякі імкнуліся арганізоўваць розныя культурныя гурткі. Разам з тым пачасціліся выпадкі выхаду палякаў з ЛКСМБ з-за нежадання адмаўляцца ад сваіх рэлігійных перакананняў[36].

Праца структур саюза сярод латышскай моладзі па-ранейшаму вялася вельмі слаба. Аднак у Віцебскім АК камсамола з'явіўся штатны работнік для працы сярод маладых латышоў[37]. Улады таксама накіроўвалі камсамольцаў у латышскія школы БССР у якасці настаўнікаў [12, с. 115].

Разам з тым сярод камсамольцаў і моладзі адзначаўся рост выпадкаў нацыянальнай варожасці і абмежаванасці, шавінізму, пасіўнага супраціўлення беларусізацыі (асабліва сярод маладых яўрэяў з мястэчак)[38].

Тым не менш праца ЛКСМБ па беларусізацыі значна ўзмацнілася. К канцу 1927 г. увесь апарат саюза быў пераведзены на беларускую мову з адначасовым абслугоўваннем моладзі нацыянальных меншасцей на іх роднай мове. У пачатку 1928 г. праца АК, РК і значнай часткі ячэек камсамола вялася на беларускай мове. На ёй у большасці праводзіліся камсамольскія акруговыя і раённыя канферэнцыі, быў выдадзены падручнік для палітнавучання камсамольцаў і несаюзнай моладзі, пры значнай частцы ячэек саюза (асабліва вясковых) дзейнічалі беларускія гурткі, ва ўсіх камсамольскіх палітшколах праводзіліся заняткі па беларусазнаўству, вялікай папулярнасцю сярод юнакоў і дзяўчат карыстаўся часопіс «Маладняк»[39].

Аднак практычныя дасягненні структур ЛКСМБ у галіне беларусізацыі былі нераўнамернымі. Цалкам толькі Калінінская камсамольская арганізацыя перайшла на беларускую мову. У шэрагу структур саюза тэмпы беларусізацыі аслабелі, тыраж «Чырвонай зьмены» моцна знізіўся[40].

[29] Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 60. Л. 71.
[30] Там жа. Воп. 1. Спр. 59. Л. 14 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 64а. Л. 588 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 251. Л. 8.
[31] Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 25. Л. 49–51 ; Там жа. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 59. Л. 19.
[32] Баталко Т. И. Строительство белорусской национальной школы в условиях политики белорусизации. 1921–1930 годы (общественно-политический аспект) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01. Минск, 1993. С. 21.
[33] Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 69. Л. 12.
[34] Там жа. Воп. 2. Спр. 174. Л. 207, 211 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 364. Л. 13.
[35] Там жа. Воп. 2. Спр. 363. Л. 1–2.
[36] Там жа. Воп. 1. Спр. 66. Л. 29 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 363. Л. 5–6.
[37] Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 4п. Воп. 12. Спр. 36. Л. 38 ; Там жа. Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 174. Л. 206.
[38] Там жа. Воп. 1. Спр. 66. Л. 27 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 174. Л. 171 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 297. Л. 2.
[39] Там жа. Воп. 1. Спр. 78. Л. 3 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 81. Л. 297 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 174. Л. 209.
[40] Там жа. Воп. 2. Спр. 306. Л. 76 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 364. Л. 11–12.

К 1928 г. беларуская мова стала асноўнай пры выкладанні ў сельскагаспадарчых і педагагічных тэхнікумах, частцы прафтэхвучылішчаў, у школах рабочай і сялянскай моладзі. Паслядоўна пераводзіліся на беларускую мову лекцыйныя курсы і семінары ў ВНУ, перш за ўсё ў БДУ. Беларусізаваліся Камуністычны ўніверсітэт, савецка-партыйныя школы, сістэма партыйна-палітычнага навучання [7, с. 18–19].

Маладыя беларускія пісьменнікі актыўна праводзілі публічныя гутаркі аб беларускай мове і культуры з мэтай іх папулярызацыі[41].

Разам з тым адміністрацыйныя формы і метады ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі ў сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установах прывялі да пэўнай напружанасці ў міжнацыянальных адносінах сярод навучэнцаў і студэнтаў БССР[42] [6, с. 61].

Так, значная частка студэнцтва была незадаволена рашэннем аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б аб тым, што выпускнікамі ВНУ лічылі толькі тых студэнтаў, якія добра валодалі беларускай мовай. На гэтай падставе ў студэнцкім асяроддзі ўзнікалі нават канфлікты[43].

Увогуле кіраўніцтва ЛКСМБ на чале з П. Галавачом недаацэньвала палітычнае значэнне задач беларусізацыі[44]. У выніку складанасці ў яе правядзенні выкарыстоўваліся палітычнымі праціўнікамі савецкай улады для пашырэння пратэстных настрояў сярод навучэнцаў і студэнтаў, што прыводзіла да ўмяшальніцтва Аб'яднанага дзяржаўнапалітычнага ўпраўлення (АДПУ) у працу навучальных устаноў [4, с. 228].

Тым не менш к 1929 г. структуры камсамола БССР дасягнулі значных поспехаў у галіне беларусізацыі, развіцці беларускай культуры і рабоце з моладдзю нацыянальных меншасцей.

Аднак з 1929 г. праца па беларусізацыі ў гарадскіх арганізацыях і рабочых ячэйках ЛКСМБ пачала слабець. У часткі камсамольскіх актывістаў назіралася пасіўнасць у яе ажыццяўленні, а акруговы актыў нават супраціўляўся беларусізацыі, бо не валодаў беларускай мовай. У 1930 г. у саюзе ўжо меліся нават цэлыя камітэты і ячэйкі, якія сабатавалі беларусізацыю[45]. Такое становішча можна растлумачыць крызіснымі з'явамі ў камсамоле ў сувязі з разгортваннем масавай прымусовай калектывізацыі.

Тым не менш ЦК ЛКСМБ на чале з М. Паляковым імкнуўся выправіць сітуацыю. Так, у снежні 1930 г. структуры саюза ўдзельнічалі ў месячніку беларусізацыі, абвешчаным ЦК КП(б)Б, які ў той час узначальваў К. Гей[46].

Цікава, што праявы беларусізацыі назіраліся і ў РСФСР. Так, з 1929/30 навучальнага года там дзейнічалі 10 беларускіх школ, настаўнікаў для якіх рыхтаваў Томскі педтэхнікум. У гэтай рэспубліцы ва ўстановах са значнымі групамі беларускага студэнцтва прадугледжвалася выкладанне беларусазнаўства і беларускай мовы [1, с. 404–405].

Афіцыйна ў 1930 г. у ЛКСМБ адзначалася адчувальнае ўмацаванне міжнацыянальнага адзінства, але ў рэчаіснасці структуры саюза слаба вялі нацыянальна-культурную працу ў маладзёжным асяроддзі і інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі[47].

З мэтай выпраўлення сітуацыі ЦК ЛКСМБ быў абвешчаны трохмесячнік беларускай пралетарскай культуры і пралетарскай культуры нацыянальных меншасцей [13, с. 3–4].

Камсамольскі друк прапагандаваў ідэі інтэрнацыяналізма, дружбы і ўзаемадапамогі [2, с. 96]. Але пры гэтым «Чырвоная зьмена» і «Юнгер арбетэр» недастаткова асвятлялі нацыянальную працу ЛКСМБ[48].

Адначасова сярод камсамольцаў (нават актывістаў) і моладзі БССР пашырыліся праявы шавінізму і антысемітызму[49], што сведчыць аб значных хібах у інтэрнацыянальным выхаванні маладога пакалення.

Увогуле другая палова 1920-х гг. характарызавалася ўзмоцненай барацьбой з антысемітызмам, які набыў шырокія маштабы і ў маладзёжным асяроддзі[50].

Нягледзячы на захады кіраўніцтва ЛКСМБ, у самім саюзе з 1931 г. пачало скарачацца выкарыстанне актывам беларускай мовы, адзначалася адмоўнае стаўленне да яе. У нізавых камсамольскіх звёнах мала ўвагі надавалася карэнізацыі актыву. Пасля 1933 г. справа беларусізацыі ўвогуле не ўзгадвалася ў дакументах камсамола[51].

---

[41]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 89. Л. 2–7.

[42]Соколов М. Н. Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2002. С. 4, 17.

[43]Евдокименко Н. Л. Проблемы становления и развития высшей школы Белоруссии (на материалах государственных и общественно-политических организаций (1921–1932 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 1993. С. 21.

[44]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Воп. 2. Спр. 396. Л. 128.

[45]Там жа. Воп. 1. Спр. 88. Л. 6 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 93. Л. 139–140, 161, 180 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 448. Л. 142 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 523. Л. 63.

[46]Там жа. Воп. 1. Спр. 105. Л. 215.

[47]Там жа. Воп. 1. Спр. 88. Л. 6 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 448. Л. 142 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 462. Л. 87 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 523. Л. 63.

[48]Рубенчык. Тэзісы да дакладу т. Рубенчыка аб нац.-культ. Будаўніцтве на X зьезьдзе ЛКСМБ. Менск: ЦК ЛКСМБ, 1931. С. 7–8.

[49]Нац. арх. Рэсп. Беларусь. Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 88. Л. 6 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 421. Л. 28 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 448. Л. 142.

[50]Там жа. Воп. 1. Спр. 62. Л. 174, 185.

[51]Там жа. Воп. 1. Спр. 100. Л. 17 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 110. Л. 254 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 112. Л. 47; Там жа. Воп. 1. Спр. 114. Л. 164, 197 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 116. Л. 85 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 120. Л. 145 ; Там жа. Воп. 1. Спр. 134. Л. 53 ; Там жа. Воп. 2. Спр. 587. Л. 3.

Тым не менш моладзь БССР працягвала актыўна ўдзельнічаць у беларусізацыі на ніве адукацыі, кадры якой у падаўляючай большасці былі маладымі і беларускамоўнымі [3, с. 139].

Да сярэдзіны 1930-х гг. былі адкрыты і дзейнічалі нацыянальныя аддзяленні пры БДУ імя У. І. Леніна, педагагічных і настаўніцкіх інстытутах, працягвалі працу два яўрэйскія і адзін польскі педтэхнікумы, Мінскі настаўніцкі інстытут нацыянальных меншасцей, яўрэйскае і польскае аддзяленні ў Магілёўскім палітасветтэхнікуме, яўрэйскае аддзяленне ў саўпартшколе і сельскагаспадарчы яўрэйскі тэхнікум [1, с. 404].

Пры гэтым у 1930-я гг. ЛКСМБ імкнуўся выхоўваць маладое пакаленне БССР у духу інтэрнацыяналізму, дружбы з іншымі народамі СССР, салідарнасці з моладдзю другіх краін, асабліва Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы. Умацоўваліся сяброўскія сувязі саюза з камсамольскімі арганізацыямі савецкіх рэспублік. ЛКСМБ праводзіў кампаніі збору сродкаў у дапамогу маладзёжным камуністычным саюзам іншых краін і нават арганізаваў міжнароднае спаборніцтва паміж камсамольцамі Мінска і Лейпцыга. Сярод маладога пакалення шырока распаўсюдзіліся такія формы інтэрнацыянальнай салідарнасці, як удзел у міжнародным юнацкім дні, кампаніі салідарнасці з палітвязнямі ў іншых краінах[52].

Увогуле напрыканцы разглядаемага перыяду КП(б)Б і ЛКСМБ паглыбілі працу па выхаванні маладога пакалення ў духу «брацкай садружнасці працоўных усіх нацыянальнасцей»[53] [14, с. 228].

## Заключэнне

Такім чынам, прыярытэт у дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы сярод моладзі мела выхаванне яе ў духу інтэрнацыяналізма. Акрамя таго, нацыянальнае выхаванне было падпарадкавана ідэйна-палітычнаму.

З мэтай задавальнення адукацыйных патрэб беларускіх, яўрэйскіх, польскіх юнакоў і дзяўчат у савецкай Беларусі з пачатку 1920-х гг. і фактычна да канца разглядаемага перыяду дзейнічалі адпаведныя нацыянальныя ўстановы адукацыі розных узроўняў.

Нацыянальна-культурная праца сярод маладых яўрэяў вялася камсамолам савецкай Беларусі з пачатку 1920-х гг. даволі актыўна, хаця і не была пазбаўлена арганізацыйных недахопаў. Пры гэтым такая ж праца ў асяроддзі маладых палякаў і латышоў ажыццяўлялася з вялікімі цяжкасцямі і хібамі. Аднак пераадолець адасоблены лад жыцця яўрэйскай моладзі не ўдавалася нават у камсамольскім асяроддзі.

Пераломным для савецкай нацыянальнай палітыкі стаў 1923 г., калі кампартыя паставіла задачу вырашыць нацыянальнае пытанне ў СССР. Аднак да верасня 1924 г. інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення і нацыянальная праца сярод яго ў Савецкай Беларусі вяліся яшчэ эпізадычна. Толькі ў 1925 г. нацыянальна-культурная дзейнасць структур ЛКСМБ узмацнілася і была арганізацыйна аформлена. Сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся працы з яўрэямі, палякамі і латышамі. Пры гэтым кіраўніцтва саюза шмат увагі таксама звяртала на ажыццяўленне беларусізацыі. У выдавецкай дзейнасці камсамола БССР выразны прыярытэт мелі выданні на беларускай мове.

Увогуле з сярэдзіны 1920-х гг. назіралася актывізацыя ўдзелу ў нацыянальна-культурным жыцці БССР як беларускіх юнакоў і дзяўчат, так і моладзі нацыянальных меншасцей.

Свайго піку правядзенне беларусізацыі ў ЛКСМБ дасягнула ў 1928 г., а з 1929 г. яно пачало слабець, што можна патлумачыць унутраным крызісам у саюзе з-за абвастрэння грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі. З 1934 г. беларусізацыя як палітычная кампанія ў камсамоле не ажыццяўлялася.

Напрыканцы 1920-х гг. з-за адсутнасці штату і недастатковай увагі кіраўніцтва ЛКСМБ нацыянальна-культурная праца ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат нацыянальных меншасцей аслабела. К сярэдзіне 1930-х гг. адбыўся адыход ад ажыццяўлення спецыяльнай нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі нацыянальных меншасцей.

З сярэдзіны 1930-х гг. дзяржаўныя і грамадскія структуры БССР адышлі ад палітызацыі моўнага пытання. Тым не менш, нягледзячы на згортванне палітыкі беларусізацыі, беларуская мова захоўвала дастаткова трывалыя пазіцыі ў жыцці рэспублікі, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі.

Удзел камсамольскіх структур у нацыянальна-культурным будаўніцтве фактычна да канца 1930-х гг. разгортваўся з цяжкасцямі: непрацяглыя ўздымы змяняліся спадамі. Толькі напрыканцы разглядаемага перыяду КП(б)Б і ЛКСМБ рэальна паглыбілі працу па выхаванні маладога пакалення ў духу інтэрнацыяналізму.

У цэлым ва ўдзеле моладзі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве ў міжваенны перыяд можна выдзеліць наступныя этапы:

[52]Бендин А. Ю. Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию студенческой молодежи (1928–1937 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01. Минск, 1989. С. 20 ; Пиульский Е. В. Деятельность комсомола Белоруссии по военно-патриотическому воспитанию молодежи в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01. Минск, 1975. С. 20–21.

[53]Пераклад наш. – *В. Д.*

1) 1921–1924 гг. – пераважна пасіўны ўдзел;

2) 1925–1928 гг. – актывізацыя ўдзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве і выразнае арганізацыйнае афармленне нацыянальна-культурнай працы ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі;

3) 1929–1934 гг. – спад тэмпаў нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі з-за грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праблем;

4) 1935–1939 гг. – развіццё нацыянальна-культурнай працы сярод юнакоў і дзяўчат у напрамку ўмацавання інтэрнацыяналізму.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Крот МС, рэдактар. *Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945).* Минск: Народная асвета; 1993. 494 с.
2. Слука ОГ. *Голос революционной молодежи: проблемы становления и развития молодежной печати Белоруссии.* Минск: Издательство БГУ; 1978. 141 с.
3. Лыч Л. *Міжваенная беларусізацыя і яе ўрокі.* Мінск: [б. в.]; 2014. 233 с.
4. Ляхоўскі У. *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.).* 2-е выданне. Смаленск: Інбелкульт; 2015. 479 с.
5. Журов А. *Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.).* Минск: Беларусь; 1970.
6. Шаўчук ІІ. *Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.).* Брэст: Выдавецтва БрДУ; 2007. 279 с.
7. Платонаў РП, Коршук УІ, рэдактары. *Беларусізацыя. 1920-я гады. Дакументы і матэрыялы.* Мінск: БДУ; 2001. 270 с.
8. Касцюк М. *Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі.* Мінск: Экаперспектыва; 2000. 307 с.
9. Касцюк М, рэдактар. *Гісторыя Беларусі: у 6 тамах. Том 5. Беларусь у 1917–1945 гг.* Мінск: Экаперспектыва; 2006. 613 с.
10. Głogowska H. *Białoruś 1914–1929. Kultura pod presją polityki.* Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 1996. 213 s.
11. Король АС. Белоруссизация. В: *Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты.* Минск: Университетское; 1990. с. 136–155.
12. Пушкін І. *Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.).* Магілёў: МДУ імя А. Куляшова; 2004. 168 с.
13. За пролетарскую культуру. Як праводзіць трохмесячнік пролетарскай беларускай культуры і пролетарскай культуры нацменшасьцяй. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва; 1930.
14. Журов АЕ, Анисов СГ, Антипов ГП. *Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии.* Минск: Беларусь; 1975. 534 с.

## References

1. Krot MS, editor. *Narodnaja adukacyja i pedagagichnaja navuka w Belarusi (1917–1945)* [National education and pedagogical science in Belarus (1917–1945)]. Minsk: Narodnaja asveta, 1993. 494 p. Belarusian.
2. Sluka OG. *Golos revolyutsionnoi molodezhi: problemy stanovleniya i razvitiya molodezhnoi pechati Belorussii* [Voice of revolutionary youth: problems of formation and development of youth press in Belarus]. Minsk: Publishing House of the Belarusian State University; 1978. 141 p. Russian.
3. Lych L. *Mizhvaennaja belarusizacyja i jae wroki* [Interwar Belarusization and its lessons]. Minsk: [publisher unknown]; 2014. 233 p. Belarusian.
4. Ljahouski U. *Ad gomanawcaw da gajsakow. Chynnasc' belaruskih maladzjovyh arganizacyj u 2-j palove XIX st. – 1-j palove HH st. (da 1939 g.)* [From gomanaucy to gajsaki. Activity of Belarusian youth organizations in the 2nd half of the XIX century – the 1st half of the XX century (until 1939)]. 2nd edition. Smalensk: Inbelkul't; 2015. 479 p. Belarusian.
5. Zhurov A. *Pod rukovodstvom partii. Deyatel'nost' KPB po sozdaniyu i rukovodstvu komsomolom Belorussii (1918–1925 gg.)* [Under the leadership of the party. The activities of the CPB for the creation and leadership of the Komsomol of Belarus (1918–1925)]. Minsk: Belarus'; 1970. Russian.
6. Shauchuk II. *Gumanitarnyja navuki w sacyjal'naj gistoryi Belarusi (20–30-ja gady XX st.)* [Humanities in the social history of Belarus (20–30s of XX century)]. Brest: Publishing House of the Brest State University; 2007. 279 p. Belarusian.
7. Platonaw RP, Korshuk UI, editors. *Belarusizacyja. 1920-ja gady. Dakumenty i matjeryjaly* [Belarusization. The 1920s. Documents and materials]. Minsk: Belarusian State University; 2001. 270 p. Belarusian.
8. Kascjuk M. *Bal'shavickaja sistjema wlady na Belarusi* [Bolshevik system of power in Belarus]. Minsk: Jekaperspektyva, 2000. 307 p. Belarusian.
9. Kascjuk M, editor. *Gistoryja Belarusi: u 6 tamah. Tom 5. Belarus' u 1917–1945 gg.* [History of Belarus: in 6 volumes. Volume 5. Belarus in 1917–1945]. Minsk: Jekaperspektyva; 2006. 613 p. Belarusian.
10. Glogowska H. Belarus 1914–1929. Culture under political pressure. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne; 1996. 213 p. Polish.
11. Korol' AS. Belorussization. In: *Stranitsy istorii Kompartii Belorussii: suzhdeniya, argumenty, fakty: sbornik statei* [Pages of the Communist party of Belarus history: judgments, arguments, facts]. Minsk: Universitetskoe; 1990. p. 136–155. Russian.
12. Pushkin I. *Nacyjanal'nyja menshasci BSSR u gramadska-palitychnym i kul'turnym zhycci (20-ja gady XX st.)* [National minorities of the BSSR in social, political and cultural life (20s of XX century)]. Mogilev: Mogilev State University named after A. Kuleshov; 2004. 168 p. Belarusian.
13. *Za proletarskuju kul'turu. Jak pravodzic' trohmesjachnik proletarskaj belaruskaj kul'tury i proletarskaj kul'tury nacmenshas'cjaj* [For proletarian culture. How to spend the three months of the proletarian Belarusian culture and the proletarian culture of national minorities]. Mensk: Belaruskae dzjarzhaunae vydavectva; 1930. Belarusian.
14. Zhyrov AE, Anisov SG, Antipov GP. *Ocherki istorii Leninskogo komsomola Belorussii* [Essays on the history of the Lenin Komsomol of Belarus]. Minsk: Belarus'; 1975. 534 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 17.07.2018.*
*Received by editorial board 17.07.2018.*